се навучання і выхавання, то працэс фарміравання культуры асобы студэнта дасць станоўчыя вынікі. На гэтай аснове студэнт можа стварыць новае, развівацца як творчая асоба.

З выказванняў і анкет можна прывесці нямала прыкладаў аб цяжкасцях у вучобе, аб іх пераадоленні, аб тым, як прыйшла вера ў сябе. Прывядзем толькі адно, але характэрнае выказванне.

Аляксандр: Першы курс мне даваўся з вялікімі цяжкасцямі. Даводзілася шмат працаваць. Ведамі не вызначаўся. А група, куды я быў залічаны, аказалася з высокім узроўнем ведаў. Мне было крыўдна і сорамна, што я шмат чаго не ведаю і не разумею. Паверце, я хачу вучыцца, і я буду вучыцца. Два гады для мяне не прайшлі дарэмна. Гэта так цудоўна! Спрабуеш разабрацца ў сабе, у здольнасцях свайго мозгу. Здаецца, усё гэта адчуваў раней, але, вывучаючы навукі, пачынаеш па-новаму ацэньваць свае погляды, паводзіны... У маёй свядомасці адбыўся выбух. Я ўбачыў шмат прыгожага там, дзе раней бачыў толькі шэрае і незразумелае. Я глянуў на свет па-новаму. Адчуваю, што змяніліся мае адносіны да самога сябе і людзей. Стаў больш думаць, лепш гаварыць, менш рабіць памылак, а гэта так важна ў жыцці. Я ведаю, што мне яшчэ шмат трэба працаваць над сабой. Але галоўнае тое, што я ўжо бачу сваю мэту, таму што без яе жыць нельга. Я лепш стаў бачыць, што мне трэба і як трэба рабіць. Цяпер я цвёрда веру, што выбраў правільны шлях.

Задача выкладчыка — паказаць сваім асабістым прыкладам, як трэба і важна публічна разважаць, натхняць, захапляць. Адзін з бакоў майстэрства выкладчыка заключаецца ва ўменні адкрываць перад студэнтам тыя сферы духу, дзе ён можа дасягнуць вышыні, праявіць сябе, быць своеасаблівым прыкладам навуковага мыслення — знаёміць студэнтаў з самымі апошнімі дадзенымі навукі, быць мастацкі адукаваным і маральным чалавекам. Таму сутнасць працы выкладчыка заключаецца не ў тым, каб «прачытаць матэрыял» студэнтам, а «навучыць чытаць матэрыял» іх, узброіць прыёмамі пазнавальнай дзейнасці, сістэмай арыентацыі ў вывучаемым курсе.

Іваноў М.В.,
*дацэнт*
Ровіна Р.А.,
*дацэнт*
Касап В.А.,
*дацэнт*

## РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ

Развіццё творчых здольнасцей асобы ўвогуле і студэнтаў у прыватнасці адносяць да адной са складаных псіхолага-педагагічных праблем. У літаратуры адсутнічае адзіны погляд на паняцце «творчасць». Яго разглядаюць, у прыватнасці, як сінтэз якасцей і асаблівасцей асобы; дзейнасць, у выніку якой ствараецца нешта новае. Нявызначанасць паняцця дрэнна адбіваецца на правядзенні канкрэтных даследаванняў.

Працэс творчага супрацоўніцтва студэнта, які працуе з выкладчыкам, носіць ярка выражаны псіхолага-педагагічны характар. Аднак тут прысутнічаюць і арганізацыйныя аспекты, ад якіх залежыць матывацыя выбару напісання менавіта дыплома. Асабліва гэта адносіцца да тых гуманітарных ВНУ, дзе дыпломныя работы пішуць толькі добра паспяваючыя студэнты.

Арганізацыя НДР студэнтаў у розных ВНУ мае сваю спецыфіку. У некаторых з іх аб навуковай тэматыцы даследаванняў кафедраў паведамляюць студэнтам на першым курсе. Кожнаму студэнту даецца поўная свабода выбару тэмы ў адпаведнасці з яго інтарэсамі. Пры жорсткай сістэме замацавання студэнтаў за канкрэтным выкладчыкам студэнты павінны пісаць дыпломныя работы ў адпаведнасці з напрамкамі навуковых інтарэсаў кіраўнікоў. Гэта зніжае матывацыйна-творчую актыўнасць студэнтаў.

Творчае супрацоўніцтва студэнта і кіраўніка залежыць ад розных фактараў, асноўныя з якіх адлюстраваны ў схеме.




На схеме паказана, што і кіраўнік, і студэнт маюць: а) мноства; б) дастаткова ідэнтычных

РЭПАЗІТОРЫЙ БрДУ

(на катэгарыйным узроўні) характарыстык. Камбінацый гэтых характарыстык можа быць вялікае мноства. Маюцца наступныя паказчыкі супрацоўніцтва (да яго пачатку аспекты 1 і 2 не сутыкаюцца). Асабістыя якасці кіраўніка дыпломнай работы маюць для студэнта вялікую значнасць. Гэта абумоўлена больш цесным творчым супрацоўніцтвам, чым з выкладчыкам, які толькі чытае лекцыі ці вядзе лабараторныя заняткі. Як правіла, студэнт пазнае гэтыя якасці раней, чым пачынае пісаць дыплом. Тут магчымы спалучэнні: маральныя якасці (сумленнасць, праўдзівасць, ціпласць, нецярпімасць да недахопаў і інш.), светапоглядныя, эстэтычныя, камунікатыўна-творчыя. Гэтыя і іншыя якасці кіраўніка могуць прыцягнуць дыпломніка. На жаль, бывае і наадварот. І ў гэтым выпадку студэнт можа падрыхтаваць добры дыплом, але працэс адносін з выкладчыкам пераўтвараецца для яго ў цяжкую псіхалагічную працэдуру. Калі выкладчык не ўспрымае асабістых якасцей студэнта, то веданне сваіх службовых абавязкаў і наяўнасць педагагічнага вопыту дазваляюць ім супрацоўнічаць даволі творча.

На схеме асабістыя якасці кіраўніка і студэнта маюць нязначны сегмент перакрыцця, што даволі распаўсюджана.

**Навуковы інтарэс**. У гэтым блоку ўзаемасувязі студэнта і кіраўніка вар'іруюцца ў трох накірунках: а) галіна навуковых інтарэсаў супадае; б) інтарэсы супадаюць часткова; в) не супадаюць (на схеме -- другі варыянт).

**Інтэлектуальныя здольнасці** звычайна падзяляюць на інтэлектуальна-лагічныя і інтэлектуальна-эўрыстычныя. У гэтым блоку ўзаемасувязі студэнта і выкладчыка на ступені перавагі будуць: а) эўрыстычныя здольнасці кіраўніка — аналагічныя ў студэнта; б) лагічныя здольнасці ў студэнта; в) лагічныя здольнасці кіраўніка — эўрыстычныя ў студэнта; г) у абодвух лагічныя здольнасці (на схеме: кіраўнік мае эўрыстычныя, а студэнт -- толькі лагічныя здольнасці).

**Стыль кіраўніка**. Вельмі важны псіхалагічны кампанент адносін студэнта і кіраўніка. У літаратуры ёсць думкі аб тым, якім павінен быць кіраўнік. Вопыт, назапашаны аўтарамі артыкула па кіраўніцтву дыпломнымі работамі, сведчыць аб неабходнасці ўліку многіх фактараў. Так, матывацыя выбару тэмы дыпломнай работы (гл. табл.)–навуковы інтарэс, нежаданне здаваць дзяржаўныя экзамены або інш. Узровень інтэлектуальных здольнасцей і ступень самаарганізаванасці студэнта таксама вызначаюць стыль кіраўніка. Напрыклад, пры эўрыстычных здольнасцях студэнта лепш выкарыстоўваць кансультуючы стыль.

Аднак, калі ў студэнта самаарганізацыя і пачуццё асабістай адказнасці развіты слаба, больш мэтазгодным будзе арганізуючы стыль ці камбінаваны.

Калі ацэньваць прыведзеную схему ўзаемаадносін студэнта і кіраўніка ўвогуле, то можна адзначыць, што па розных паказчыках перавага была ці на адным, ці на другім баку ( улічваючы ўмоўнасць схемы, гэта перавага адлюстравана пераходам круга ўверх ці ўніз ).

Разумеючы складанасць і разнастайнасць падыходаў, методык і інструментарыя такіх даследаванняў, спынімся на варыятыўнасці фактараў, ад якіх залежыць канчатковы вынік — узровень дыпломнай работы, і на іх паказчыках.

Нам уяўляецца неабходным выкарыстаць пры разглядзе гэтых фактараў метады фасетнай класіфікацыі (гл.табл.) з дапамогай канкрэтных прыкладаў з практыкі кіраўніцтва студэнцкімі дыпломнымі работамі аўтараў гэтага артыкула.

У фасеце (блоку) «Матывацыя студэнта» ў нашым універсітэце найбольш сустракаюцца M1 — навуковы інтарэс і M3 — не здаваць дзяржаўныя экзамены (M2 найбольш распаўсюджаны сярод замежных студэнтаў).

Ступень самастойнасці студэнтаў, іх падрыхтаванасць да навуковай дзейнасці залежаць ад агульнага інтэлекту, ад этапаў работы над дыпломам і ад ступені расчаравання. Так, некаторыя даследаванні сведчаць, што толькі 2% дэманструюць поўную самастойнасць у выбары тэмы, складанні першага варыянта плана, здольнасці абараніць свой пункт гледжання і г.д. Высветлена, што на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

першым курсе каля 3/4 студэнтаў жадаюць займацца НДР, але да 4-5 курсаў гэты паказчык зніжаецца да 20-22%.

Фасет (блок) «Віды інтэлектуальных здольнасцей» мае дыхатамічнае дзяленне, але могуць быць і іншыя (пераходныя) узроўні. Развіццё гэтых зольнасцей залежыць не толькі ад кіраўніка дыпломнай работы, але і ад узроўню выкладання ў ВНУ: аб'ёму праблемных лекцый, пастаноўкі творчых задач, увогуле ад стану развіццёвага навучання.

Такім чынам, развіць інтэлектуальна-лагічныя здольнасці студэнта ў інтэлектуальна-эўрыстычныя — гэта задача ўсіх выкладчыкаў у працэссе навучання. Вынікам такой сумеснай дзейнасці з'яўляюцца тры ўзроўні паказчыкаў у фасеце (блоку) «Узроўні здольнасцей». Гэтыя адзнакі, як правіла, карэлююцца і з агульнай пасапяховасцю, і з водгукамі кіраўнікоў НДРС. Па назіраннях аўтараў артыкула, студэнты з высокімі здольнасцямі складаюць больш паловы, з нізкімі — адзінкі.

Як мы ўжо адзначылі, стыль кіраўніка часцей за ўсё сфарміраваўся да сустрэчы. Разам з тым поспех супрацоўніцтва залежыць ад здольнасці кіраўніка заахвоціць студэнта ў неабходных выпадках і ад яго такта ў выпадках, калі студэнт не выканаў ці недастаткова поўна выканаў заданне.

**Фасетная табліца паказчыкаў дыпламанта і кіраўніка**

| матывацыя студэнта | ступень самастойн. | віды інтэлект.здольнасцей | узроўні здольнасцей | стыль кіраўніка | узроўні абароны дыплома |
|---|---|---|---|---|---|
| М1 - навуковы інтарэс | С1- высокая | J1 - эўрыстычныя | У1 - высокія | К1 - капсультацыйны | А1-свабоднае валоданне матэрыялам ( выдатна ) |
| М2-даказаць сабе (іншым) | С2-сярэдная | J2-лагічныя | У2-сярэднія | К2-кіруючыя | А2-асобныя цяжкасці у адказах ( добра ) |
| М3-не здаваць дзярж-экзамены | С3-нізкая | | У3-нізкі | К3-камбінаваны | А3-слабае валоданне матэрыялам (здавальн.) |

*Заўвага. Табліца дазваляе скласці поўнае ўяўленне аб паказчыках студэнта. Напрыклад, студэнтка Падрэз І. мае каэфіцыент М 1 С 1 J 2 У 2 К 1 А 1. Пры сярэдніх здольнасцях змагла самастойна распрацаваць тэму і выдатна абараніцца. Тадзілі І. мела каэфіцыент М 2 С 2 J 1 У 2 К 3 А 1. Вельмі выразна было жаданне даказаць сабе і іншым. Пры пэўнай дапамозе кіраўніка выдатна абаранілася.*

Студэнты тонка і адэкватна ацэньваюць рэакцыю, і чым яна (рэакцыя) больш дакладна адпавядае прычынам, чым тактоўней яна, тым большае прыносіць задавальненне абодвум бакам, а вынік эфектыўнасці супрацоўніцтва найбольш выразна праявіцца пры абароне дыплома.

Вельмі важнае значэнне мае яшчэ адзін аспект творчага супрацоўніцтва студэнта і кіраўніка, гэта інфармацыйны. Размова ідзе аб інфармацыйным суправаджэнні работы над дыпломам, якое ўключае: узровень інфармацыйна-бібліяграфічнай арыентацыі ў бібліятэках, розных выданнях, ступень іх даступнасці, жадання і здольнасці знайсці не толькі профільныя, але і сумежныя крыніцы. На наш погляд, большая частка студэнтаў валодае невысокім ці сярэднім узроўнем пералічаных якасцей.

У сувязі з пераходам універсітэта на 5-гадовыя планы навучання, у адпаведнасці з якімі дыпломныя работы будуць выконваць усе студэнты, паўстае шэраг дадатковых сур'ёзных задач і праблем арганізацыйна-метадычнага і псіхолага-педагагічнага плана.

Па-першае, дыпломныя работы пераходзяць у катэгорыю НДР студэнтаў без паніжэння якасці. Па-другое, вядома, што ўзровень здольнасцей студэнтаў розны, і падрыхтаваць дыплом студэнту, які слаба займаецца, — задача вельмі складаная.

Наступны аспект — права свабоднага выбару студэнтамі тэмы дыплома. На нашу думку, для гэтага неабходна: а) прадставіць студэнтам інфармацыю аб дысцыплінах, ас-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пектах і кіраўніках; б) даць магчымасць студэнтам авалодаць культурай навуковай працы шляхам увядзення адпаведных курсаў.

У сувязі з гэтым мы прапануем тры падыходы прадстаўлення інфармацыі: дысцыплінарна-аспектнай, аспектна-дысцыплінарнай і персаніфікаванай. Нам здаецца, што па меры навучання студэнт зможа больш дакладна рэалізаваць свае здольнасці.

Наступная праблема — пераарыентацыя дыпломаў да патрэб бібліятэчна-бібліяграфічнай практыкі рэспублікі шляхам сумеснага ўдзелу студэнтаў у навуковых праектах бібліятэк, шырокага выкарыстання рэгіянальнага вопыту студэнтамі факультэта завочнага навучання.

Псіхолага-педагагічныя праблемы ўзаемадзеяння студэнтаў і кіраўнікоў узнікаюць перад усімі студэнтамі і асноўнай колькасцю выкладчыкаў. Гэта патрабуе ўдасканалення педагагічнага майстэрства прафесарска-выкладчыцкага складу па наступных аспектах: развіццё і ўдасканаленне псіхолага-педагагічнага мыслення, прафесійнай падрыхтоўкі, развіццё ініцыятывы і творчасці ў сябе і ў студэнтаў, праца над сваімі асобнымі якасцямі.

**Каралькоў М.Н.,**
*дацэнт*

## РАЗВІЦЦЁ ЭСТЭТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ
### (ПРАБЛЕМЫ, ТЭНДЭНЦЫІ)

Перш чым гаварыць аб развіцці эстэтычнай культуры студэнтаў, неабходна ўдакладніць, па якіх накірунках весці фарміраванне эстэтычнай культуры асобы, удакладніць, што ўваходзіць у паняцце эстэтычнай культуры. Большасць эстэтыкаў выказваюць думку, што эстэтычная культура асобы — гэта адзінства эстэтычных ведаў, перакананняў і нормаў дзейнасці і паводзін. Пры гэтым падкрэсліваецца, што фарміраванне эстэтычнай культуры асобы азначае мэтанакіраванае, паступовае і паслядоўнае набліжэнне да найвышэйшай ступені развіцця ўсёй сістэмы якасцей асобы. Кожны этап яе развіцця характарызуецца пэўнымі асаблівасцямі (узроставымі, сацыяльна-псіхалагічнымі і інш.).

Кампаненты эстэтычнай культуры функцыянальна звязаны. Веды акрэсліваюць кругагляд асобы, перакананні — накірунак эстэтычных ацэнак, поглядаў і густаў, ідэйнай пазіцыі наогул — эмацыянальную накіраванасць жыццядзейнасці, эстэтычныя нормы выступаюць як інструменты рэгуляцыі практыкі. эстэтычныя адносіны задаюць прадметную арыентацыю, сацыяльную канкрэтнасць рэалізацыі эстэтычнай культуры і дзейнасці.

Эстэтычная культура выконвае пэўныя функцыі: інфармацыйна-пазнавальная функцыя звязана з рэалізацыяй ведаў асобы; каштоўнасна-арыентацыйная — з рэалізацыяй эстэтычных перакананняў; дзейнасна-валявая — з рэалізацыяй эстэтычных здольнасцей, якія вызначаюць сацыяльна-творчую накіраванасць эстэтычнай культуры; камунікатыўна-рэгулятыўная функцыя выступае як мадэль эмацыянальнай і нарматыўнай самарэгуляцыі паводзін і дзейнасці асобы.

Эстэтычная культура абумоўлівае змест, форму, аб'ём, прадукцыйнасць эстэтычнай дзейнасці, а эстэтычныя адносіны вызначаюць галоўныя накірункі гэтай дзейнасці, яе выбіральнасць. Гатоўнасць рэалізаваць сістэму эстэтычных адносін у штодзённай дзейнасці-паказчык развіцця эстэтычнай культуры, сведчанне здольнасці чалавека эстэтычна актыўна дзейнічаць.

Аб сфарміраванасці эстэтычнай культуры мы мяркуем на падставе таго, як і ў якой канкрэтнай форме рэалізуецца на практыцы сістэма асабістых эстэтычных адносін, што накіроўваюць чалавека на практычнае прымяненне эстэтычных нормаў і крытэрыяў ацэнкі, якія ў сваю чаргу дапамагаюць адэкватна арганізаваць паводзіны, вызначыць творчае вырашэнне ўзнікаючых праблем і задач.

Эстэтычнае развіццё асобы адбываецца на працягу ўсяго жыцця чалавека. Мы можам, вызначаючы яго тэндэнцыі, умоўна гаварыць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ